УДК 373.2

# ВЫХАВАННЕ АСНОЎ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ДАШКОЛЬНЫМ УЗРОСЦЕ

# EDUCATION OF THE FUNDAMENTALS OF CIVIL-PATRIOTIC CULTURE IN PRESCHOOL AGE

***А. В. Грышчанкова / A. Hrushcankova***

*Горацкі педагагічны каледж установы адукацыі “Магілеўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А.Куляшова”*

*агр. Леніна, Рэспубліка Беларусь*

У артыкуле вядзецца размова пра выхаванне асноў грамадзянска-патрыятычнай культуры ў дашкольным узросце.Раскрываецца задача далучэння дзяцей да гісторыі роднага краю, яго традыцый.

Today, educators and parents face a difficult task: to reveal to children the richness and uniqueness of their native land, its history, to help them realize the main features of the national character of Belarusians, to feel themselves an integral part of this beautiful land, a wonderful people.

***Ключавыя словы:***грамадзянска-патрыятычная культура; нацыянальная самасвядомасць; дашкольны ўзрост.

***Keywords:*** civic-patriotic culture; nationalself-awareness; preschool age.

Адной з асноўных задач адукацыі і выхавання ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляецца фарміраванне патрыятызму, далучэнне дзяцей да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей. Нацыянальнае выхаванне дае магчымасць дашкольнікам далучыцца да самабытнай культуры, усвядоміць сваю прыналежнасць да нацыі, багатай сваімі традыцыямі і звычаямі, дасягненнямі ў галіне культуры, навукі, адукацыі [1].

Нацыянальная самасвядомасць з’яўляецца духоўным здабыткам асобы, складае аснову яе жыццядзейнасці.В. Цяпінскі ў сваіх творах адзначаў , што ў аснове патрыятычнага выхавання ляжыць прывіцце любові да духоўнай спадчыны народа – яго мовы, культуры.

Дашкольны ўзрост з’яўляецца найбольш спрыяльным перыядам для авалодвання дзецьмі элементамі беларускай народнай культуры, бо менавіта ў гэты прамежак жыцця ў дзіцяці фарміруецца цікавасць і патрэба да ведаў. Аднак, як паказвае практыка, на сенняшні дзень вынікі працы ў дадзеным накірунку не вельмі высокія. Гэта абумоўлена недахопам ці адсутнасцю беларускамоўнай практыкі ў дзяцей, недастатковай сфарміраванасцю камунікатыўных якасцей маўленчай дзейнасці; бедным слоўнікавым запасам, уплывам рускай мовы. Большая колькасць бацькоў выхаванцаў увогуле не звяртаецца да спадчыны беларускай народнай культуры.[3, с.4 ].

Сення сам час патрабуе звярнуцца да сваіх вытокаў. Таму неабходна арганізоўваць і праводзіць работу ў наступных накірунках:фарміраванне ў дзяцей ўсведамлення іх этнічнай прыналежнасці да пэўнай культуры, народа праз азнаямленне з прыродай роднага краю;выхаванне паважлівых адносін да бацькоў, да продкаў, пашырэнне і паглыбленне ведаў аб Радзіме;далучэнне выхаванцаў да ўсіх відаў нацыянальнага мастацтва (архітэктуры, жывапісу, танца, музыкі, літаратуры і г.д.) і выхаванне на іх аснове духоўнасці, маральнасці, этычных пачуццяў;узбагачэнне маўлення дашкольнікаў на аснове твораў беларускага фальклору[2, с. 3-8].

Пры планаванні работы па дачыненні дзяцей да беларускай народнай культуры неабходна імкнуцца выкарыстоўваць розныя формы: спецыяльна арганізаваныя заняткі, пазнавальныя гутаркі, размовы, сумесную дзейнасць педагога і дзяцей, гульні, тэматычныя прагулкі і экскурсіі, назіранні ў прыродзе, святы, забавы і інш.

На наш погляд, найбольш удалымі і эфектыўнымі сродкамі арганізацыі дзейнасці дзяцейз’яўляюцца:зносіны на роднай мове, традыцыі, звычаі, абрады, святы; фальклор ва ўсіх яго праяўленнях; прадметы і аб’екты матэрыяльнай культуры.

Вельмі важна не забываць і аб тым, што выхоўваць патрыятычныя пачуцці здольны толькі той педагог, які сам добра валодае роднай мовай, дасканала ведае традыцыі і звычаі, гісторыю свайго народа, адчувае гонар за беларускую культуру і здольны перадаць гэтае адчуванне дзецям.

Працэс фарміравання грамадзянска-патрыятычнай культуры складаны і доўгі. А пачынаць яго перш за ўсе трэба зазнаямлення з родным краем, праз выкарыстанне сродкаў вуснай народнай творчасці. Трэба стварыць такія ўмовы, каб кожнае дзіця магло адчуваць сябе часткай сваей краіны. З гэтай мэтай карысна аформіць у групе куток “Мая Радзіма – Беларусь”, дзе можна размясціць макет карты Беларусі, альбомы жывел і раслін Беларусі, лялек у нацыянальным адзенні, беларускую дзіцячую літаратуру, альбомы з песенькамі, забаўлянкамі, загадкамі і малюнкамі да іх, аўдыязапісы фальклорных твораў, дыдактычныя гульні (“Назаві па-беларуску”, “Упрыгожым адзенне”) і інш.

Пры азнаямленні з роднай прыродай педагог вучыць бачыць прыгажосць таго месца, дзе дзіця нарадзілася і жыве. Вучыць назіраць за прыродай, захапляцца яе прыгажосцю, выхоўвае жаданне берагчы яе. Пры гэтым важна падмацоўваць свае словы чытаннем літаратурных і фальклорных твораў (вершаў, забаўлянак, загадак). Таксама педагог павінен выказваць свае адносіны да прыгажосці прыроды. Бо гэта больш за якія словы ўздзейнічае на адкрытую дзіцячую душу.Замацаваць атрыманыя веды дапаможа выкананне творчых заданняў (падабраць матэрыял для газеты, калажа “Я люблю свой горад (веску)”, “Вольны адпачынак у парку”), якія дзецi будуць выконваць разам з бацькамі.

Мэтазгодна планаваць экскурсіі, прагулкі па вуліцах, у парк, падчас якіх варта звярнуць увагу не толькі на сезонныя змены ў прыродзе, але і на прыгажосць родных мясцін, на добрае ўладкаванне горада (вёскі). Варта падкрэсліць, што зроблена ўсе гэта нашымі працавітымі землякамі.

Дзецям будзе больш цікава знаеміцца з народнай культурай, калі да ўдзелу ў занятках далучыць іх бацькоў, дзядуль і бабуль, а пры магчымасці – народных майстроў, супрацоўнікаў музеяў, артыстаў.

Фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці будзе садзейнічаць арганізаваная працоўная дзейнасць (афармленне альбомаў, выраб цацак), якую карысна спалучаць з выкарыстаннем прыказак, прымавак, казак. Гэта зацікавіць дзяцей і дазволіць ім імкнуцца да атрымання добрых вынікаў, быць сумленнымі, працавітымі, адказнымі, вынослівымі.

Знаемства  дзяцей падчас экскурсій з прадукцыяй беларускіх вытворцаў, сустрэчы з вядомымі людзьмі дапамогуць сфарміраваць ў іх больш поўныя  ўяўленні пра нашу краіну.А усе гэта садзейнічае выхаванню ў маленькіх грамадзян патрыятызму, жадання знаеміцца з багатай гістарычнай і культурнай спадчынай свайго народа, рабіць усе магчымае, каб наша Бацькаўшчына квітнела больш і больш з кожным днем.

На занятках па развіцці маўлення, а таксама пры арганізацыі тэматычных вечарын, тыдняў, свят, педагогі знаемяць дзяцей з этнічнымі прыметамі жыхароў нашай рэспублікі, мовай народа, лепшымі творамі фальклору і беларускай дзіцячай літаратуры, тым самым ўзбагачаюць слоўнік дзяцей роднымі беларускімі словамі і вобразнымі выразамі, вучаць правільна ўжываць іх ў маўленні.

На занятках па музычным выхаванні дзеці знаемяцца з асаблівасцямі беларускай народнай музыкі, з народнымі музычнымі інструментамі, развучваюць беларускія песенькі, танцы, знаемяцца з народным тэатрам “Батлейка”.

На занятках па мастацка-выяўленчай дзейнасці (маляванне, аплікацыя, лепка) дзеці маюць магчымасць пазнаеміцца з дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам беларусаў (выцінанка, ткацтва, вышыўка і г.д.).

Усвядомленаму імкненню дзяцей да авалодання культурнымі эталонамі ўзаемадзеяння ў калектыве будзе спрыяць арганізацыя з імі гульняў-драматызацый і інсцэніровак на асновелітаратурных твораў і фальклорных казак (“Як курачка пеўніка ратавала”).

Вельмі вялікі выхаваўчы патэнцыял маюць народныя святы (“Купалле”, “Масленіца”, “Каляды”) і абрады (“Гуканне вясны”). Важна далучаць дзядзей да ўдзелу ў іх. Яны не толькі задавальняюць дапытлівасць дзяцей, іх эстэтычныя патрэбы, цягу да рухаў, але і пабуджаюць да супрацоўніцтва, фарміруюць творчае мысленне, адным словам, вучаць пазнаваць беларускую культуру.

Як паказвае вопыт, усе вышэй пералічаныя формы работы прадугледжваюць высокую актыўнасць маленькіх выхаванцаў.Каб работа па фарміраванні грамадзянска-патрыятычнай культуры выхаванцаў была больш паспяховай, трэба будаваць яе ў цеснай сувязі з бацькамі, бо менавіта ў сям'і фарміруюцца жыццевыя прынцыпы дзіцяці, іх звычкі.Урокі, якія дзіця атрымлівае ў сям'і, маюць вялікую выхаваўчую сілу, бо гэтыя ўрокі даюць ім самыя блізкія людзі. Таму неабходна пашыраць веды бацькоў у гэтым накірунку, раіць ім размаўляць са сваімі дзеткамі па-беларуску, расказваць пра родны край, яго прыроду, выдатных людзей, гісторыю, больш шырока выкарыстоўваць у выхаванні дзяцей творы беларускага фальклору і беларускай дзіцячай літаратуры.

Калі работа педагога і бацькоў па фарміраванні ў выхаванцаў грамадзянска-патрыятычнай культуры будзе ўзгодненай, сістэматычнай, паслядоўнай, то яна абавязкова будзе садзейнічацьвыхаванню ў дзяцей пачуцця павагі і гонару за свой народ, яго мову, гісторыю, культуру. [3, с.5].

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Канцэпцыя бесперапыннага выхавання дзяцей і моладзі ў Рэспубліцы Беларусь: пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 15.07.2015 № 182
2. Краскоўская, Г.І. Патрыятычнае выхаванне дашкольнікаў / Г.І.Краскоўская. – Мінск:Издательство Гревцова, 2010. –112 с.
3. Паўлаў, С.В. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці сродкамі вуснай народнай творчасці / С.В.Паўлаў. – Мазыр: Белы Вецер, 2010. – 148 с.